ТАЦЯНА САПЕГА
МАРЫЯ КАРАЛЁВА

# СКАРЫНА дзеткам





Вітаю, сябры!

Мяне завуць **Францішак**. Я нарадзіўся больш за 500 гадоў таму ў Полацку. Мой родны горад заўсёды быў слаўны сваёй старажытнай гісторыяй. Ён меў багатую кніжную спадчыну. Гэта быў сапраўдны культурны і эканамічны цэнтр нашай краіны – **Вялікага Княства Літоўскага**. У Полацку я правёў сваё дзяцінства, навучыўся чытаць і пісаць. Больш за ўсё на свеце любіў кнігі! Яны тады былі рукапісныя. Я шмат чуў пра Афрасінню Полацкую, нашу славутую асветніцу. Яна даўней сама перапісвала кнігі і вучыла дзетак чытаць.



Герб Полацка







Полацк

**1. Знайдзі і падкрэслі родны горад Францішка на мапе Вялікага Княства Літоўскага.**

**2. Хто яшчэ з беларускіх дзеячаў нарадзіўся ў Полацку? Падкрэслі правільныя адказы. Калі не ведаеш – пашукай у сеціве!**

| | | |
|---|---|---|
| Рагнеда | Афрасіння Полацкая | Кірыла Тураўскі |
| Сімяон Полацкі | Пятро Васючэнка | Уладзімір Арлоў |



Я з радасцю спазнаваў Бога і навакольны свет. Спачатку я вучыўся ў школах Полацка і Вільні. Пасля паступіў у **Кракаўскі ўніверсітэт** на факультэт філасофіі. Выкладалі там навукоўцы з Польшчы і іншых краін Еўропы. Асноўнай мовай навукі была лацінская. Я добра ведаў яе!
Я спасцігаў навукі, якія называліся **«сем вольных мастацтваў»**, – граматыку, рыторыку, логіку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію і музыку. Пасля навучання ў Кракаве я вытрымаў экзамен на ступень бакалаўра філасофіі.



Герб Вільні



Герб Кракава

**3. Злучы лініяй навуку і яе азначэнне.**

| | |
|---|---|
| *Граматыка* | Навука пра лікі і дзеянні з імі |
| *Рыторыка* | Навука пра мову і пісьмо |
| *Логіка* | Навука пра красамоўства |
| *Арыфметыка* | Навука пра спосабы мыслення |
| *Геаметрыя* | Мастацтва гукаў і мелодый |
| *Астраномія* | Навука пра нябесныя целы і з'явы |
| *Музыка* | Навука пра фігуры і іх уласцівасці |



Вільня



Кракаў

**4. Напішы назвы гарадоў, дзе Францішак Скарына нарадзіўся і дзе вучыўся ва ўніверсітэце.**

□□□А□□ □□А□А□

Я прагнуў новых ведаў, таму прадоўжыў навуку ў Еўропе. Атрымаў ступень доктара філасофіі і набыў медыцынскія веды. Потым здаў экзамен на ступень доктара медыцыны ў **Падуанскім універсітэце**. Экзамен быў з трох этапаў. А ў камісію ўваходзілі больш за трыццаць паважаных навукоўцаў Італіі. Я трымаўся годна: упэўнена адказваў на ўсе пытанні і паспяхова здаў экзамен.





**5. Як ты думаеш, на якой мове Францішак размаўляў з навукоўцамі на экзамене ў Падуанскім універсітэце? Падкрэслі правільны адказ.**

польская  італьянская  беларуская  лацінская

**6. Як ты думаеш, чаму здаўна ў бібліятэках, архівах і ўніверсітэтах трымалі катоў? Палічы, колькі каткоў на малюнку.**




**7. Якія навуковыя ступені меў Францішак Скарына? Правядзі лініі, каб паказаць правільны адказ.**

**ДОКТАР**

філасофіі  гісторыі  батанікі  тэалогіі  медыцыны  права  літаратуры

Цягнікоў, аўтамабіляў і нават ровараў тады яшчэ не было, але я падарожнічаў па ўсёй Еўропе. Заязджаў і ў Венецыю. Гэты горад быў адным з найвялікшых кніжных цэнтраў.



Герб Венецыі






Тут друкавалі і прадавалі шмат кніг. А ў маёй краіне іх яшчэ перапісвалі ад рукі. Ужо тады я пачаў марыць пра друкаваныя кнігі для свайго народа.






Мяне ўразіў вялікі **драўляны варштат**, а таксама «рухомыя літары» – металічныя літары, якія складваліся ў наборную касу. Работнік браў адтуль патрэбную літару і выкладваў радок за радком на наборную дошку. Заўважце, што металічныя літары зроблены ў люстраным выглядзе.



**Наборная каса**



**Рухомыя літары**



**Наборная дошка**

**8. Прачытай і запішы тэкст, складзены з металічных літар.**

ЛЮБІЦЕ КНІГУ, БО ЯНА КРЫНІЦА МУДРАСЦІ.

________________________________________

**9. Напішы з дапамогай люстэрка тэкст, як бы ён выглядаў у металічным наборы.**

КОЛЬКІ СЛОЎ У КНІЗЕ – ГЭТУЛЬКІ Ў ЁЙ ТАЯМНІЦ.

________________________________________

Я намерыўся заняцца друкарскай справай, якая была невядомай у Вялікім Княстве Літоўскім. І пастанавіў выдаць на **роднай мове** кнігі Бібліі. Ад ранку да позняга вечара я рыхтаваў кнігі Старога Запавету да друку. Перакладаў тэксты, пісаў каментары, маляваў шрыфты і эскізы гравюр.



Герб Прагі





У Празе я арандаваў адну з друкарняў разам з абсталяваннем і работнікамі. Там і былі надрукаваныя мае **дваццаць тры кнігі**. Я хацеў пераказаць Слова Божае лёгкай мовай звычайным людзям. Каб простыя людзі чыталі Біблію і бралі адтуль веды для душы і розуму. Я марыў, каб кнігі былі зручныя для чытання. Каб былі прыгожыя і з карцінкамі. Так і атрымалася! Я быў натхнёны і шчаслівы!



**10. Дзе Скарына выдаў першую кнігу? Падкрэслі правільны адказ.**

Парыж Прага Полацк Пінск

**11. Як называюцца кнігі, што выдаваў Скарына? Падкрэслі правільны адказ.**

Мае вандроўкі Прыгоды Францішка Біблія Гісторыя Беларусі

**12. Дамалюй кнігі на паліцы, каб іх атрымалася гэтулькі, колькі выдаў Скарына ў Празе.**



Калі сёння мы разгортваем хоць якую кнігу, то адразу шукаем вачыма **тытульную старонку**. Гэта першая старонка, дзе пазначаны асноўныя звесткі пра кнігу. Даўней кнігі не мелі вокладкі і прадаваліся без «адзення». Пасля ўжо ўладальнік сам замаўляў у майстэрні скураную аправу. А пакуль яна ляжала ў кнігарні, тытул быў своеасаблівай рэкламай. Тытульная старонка з’явілася ў другой палове пятнаццатага стагоддзя. А праз сто гадоў у Еўропе ўжо амаль не было кніг без тытула. Я таксама стварыў прыгожы тытул да кніг Бібліі. Пасярэдзіне старонкі напісаў назву кнігі і выдаўца (то-бок сябе).





Старонкі кніг я ўпрыгожыў невялікімі малюнкамі – **застаўкамі**, якія пачынаюць тэкст. Пасля гэтага застаўкі надоўга ўвайшлі ў моду беларускай друкаванай кнігі.

**13. Паспрабуй аднавіць застаўку. Злучы пункты рыскамі і расфарбуй. У цябе атрымаецца каляровая застаўка ў выглядзе арнаменту.**









На тытульнай старонцы ўнізе я размясціў выяву сонца і маладзіка́ (паўмесяца), якія сышліся разам. Асаблівасць маёй выявы ў тым, што сонца і маладзік маюць чалавечыя аблічча.

**«Сонца маладзіковае»** – гэта мой выдавецкі знак, па якім лёгка пазнаць мае кнігі.

Чаму я ўзяў сабе такі знак? Некаторыя навукоўцы выказваюць здагадку, што ў дзень майго нараджэння адбылося сонечнае зацьменне. Але я пакуль не буду раскрываць гэтай таямніцы.

Кожны вядомы еўрапейскі друкар ствараў сваю выдавецкую марку. Славуты АльдаМану́цыа, венецыянскі друкар, таксама меў яе. Гэта была выява дэльфіна, што абвівае якар.








**14. Прыдумай і намалюй свой выдавецкі знак.**

**15. Пасярэдзіне старонкі напішы назву выдання, якое надрукаваў Скарына ў Празе. Расфарбуй кветкавы арнамент, каб тытульная старонка стала яшчэ прыгажэйшая. Унізе злева намалюй «Сонца маладзіковае» з усмешлівымі тварыкамі.**







**Ініцыял** – першая літара тэксту, якая вылучаецца сярод іншых. Яна большая памерам і прыгажэйшая. Гэтак літара прыцягвае ўвагу чытача да пачатку тэксту. У рукапісах і першых друкаваных кнігах ініцыялы малявалі ад рукі. У маіх жа кнігах яны надрукаваныя з **дрэварытаў** (гравюр на дрэве). Рабілі гэта так. На невялікіх драўляных дошчачках гравёр выразаў літары з рознымі малюнкамі. Там былі выявы раслін, рыб, птушак, звяроў і людзей. Пасля на дошчачку наносілі фарбу і рабілі адбіткі на старонках. Для друку ініцыялаў было зроблена больш за 100 гравюр. І сёння ў кнігах можна ўбачыць прыгожыя ініцыялы. З іх часта пачынаюцца раздзелы або апавяданні. Памятай, што гэта даўняя традыцыя кніжнай культуры.



**16. Ствары свой ініцыял з дапамогай бульбы. У цябе атрымаецца своеасаблівая гравюра!**



Сырую бульбіну вымый і разрэж напалам. На зрэзе намалюй алоўкам эскіз якой-небудзь літары. Напрыклад, той, з якой пачынаецца тваё імя. Вазьмі люстэрка і правер, каб літара была павернутая справа налева! Папрасі дарослага выразаць ножыкам усё вакол малюнка. Пасля гэтага літара павінна выступаць над паверхняй. Намаж на яе фарбу і прыцісні да паперы.

Да кожнага выдання я дадаў **прадмовы і пасляслоўі**. Там я напісаў пра важнасць чытання Біблії, а таксама пра любоў да навучання, да роднай мовы і зямлі.

**17. Размясці словы ў такім парадку, каб атрымаліся крылатыя выразы з твораў Францішка Скарыны.**

трэба чалавеку кнігай дружбаваць Усякаму з

лекі і людскога люстэрка жыцця Кніга – душэўныя

крыніца бо кнігу, яна – Любіце мудрасці

шануйце, слова роднае Любіце і як святыню,

Колькі гэтулькі ў ёй таямніц – ў кнізе слоў

Я разумеў важнасць сваёй працы. Таму хацеў пакінуць для нашчадкаў выяву першага беларускага друкара (гэта значыць сябе). І змясціў **свой партрэт** у кнігах. На гравюры я паказаны ў часе перакладу Біблії. Я сяджу за невялікім сталом з разгорнутым сшыткам. У правай руцэ трымаю пяро. Мой позірк накіраваны на кнігу, што стаіць на падстаўцы. Апрануты я ўрачыста – у доўгую мантыю.

Вакол мяне розныя рэчы. Тут і кнігі, і пясочны гадзіннік, і «глобус Сусвету» ды іншыя прадметы. Усе яны паказваюць мае рознабаковыя інтарэсы. Брама, утвораная з калон і раслінны гірлянды, стварае ўзвышаны настрой. Мой партрэт – гэта адначасова мая візітоўка і маё вітанне чытачам!

**18. Уважліва разгледзь гравюру, знайдзі і размалюй рознымі колерамі:**

- кнігі
- гірлянду з дубовага лісця
- выявы двух ільвоў
- пясочны гадзіннік (прылада для вымярэння часу)
- гліняны збанок
- пчалу (або муху)
- «глобус Сусвету» (мадэль нябеснай сферы)
- ручнік
- барэт
- мантыю (доўгае і шырокае адзенне навукоўца)
- «Сонца маладзіковае» (выдавецкі знак)





У прадмове да «Кнігі Юдзіф» я змясціў верш пра любоў да роднай зямлі. Гэта запавет для кожнага беларуса. Паэт **Алесь Разанаў** пераклаў яго з старой беларускай мовы на сучасную.

**19. Вывучы верш на памяць і раскажы сваім бацькам і сябрам.**

Як звяры,
што блукаюць у пушчы,
ад нараджэння
ведаюць сховы свае,
як птушкі,
што лётаюць у паветры,
помняць
гнёзды свае,
як рыбы,
што плаваюць у моры і ў рэках,
чуюць віры свае
і як пчолы
бароняць вуллі свае –
гэтак і людзі
да месца, дзе нарадзіліся
і ўзгадаваны ў Бозе,
вялікую ласку маюць.

**20. Адкажы на пытанні:**

Хто ведае сховы свае?
Хто помніць гнёзды свае?
Хто чуе віры свае?
Хто бароніць вуллі свае?





Першай кнігай, якую я выдаў у Празе, стаў **Псалтыр** – адна з біблійных кніг Старога Запавету. З даўніх часоў гэтую кнігу выкарыстоўвалі для навучання грамаце. У пасляслоўі да яе, у калафоне, я пазначыў дакладную дату завяршэння працы. Дзякуючы гэтаму вядомы дзень нараджэння беларускай друкаванай кнігі. Гэта **6 жніўня 1517 года**.



БЫТЬЄ

То есть конець первыхъ книгъ Моисеовыхъ
еже от евреи называются Брешисъ. По греческии
же и полатине именуются Генезисъ. А по руски
Бытье. Божиею помощию з уполне выложе
ны и вытиснены. Повелениемъ и праце
стью учоного мужа в лекарскихъ
наукахъ доктора Франциска Ско
рины с Полоцка. В великомъ
месте Празскомъ. По
летехъ воплощения
Слова Божия
Тысещного
пятсотого
девят
на I

Слова **«калафон»** перакладаецца як «завяршэнне, вянок». Яно азначае тэкст на апошняй старонцы са звесткамі пра аўтара, час і месца стварэння кнігі. Часта завяршэнне тэксту афармлялася ў выглядзе прыгожай «хустачкі».

**21. Паспрабуй напісаць маленькі аповед і аформіць яго ў калафоне трыкутнікам.**



Пасля Прагі я пастанавіў вярнуцца на радзіму. Прыехаў у Вільню і заснаваў там друкарню. Яна была першай у нашай краіне – Вялікім Княстве Літоўскім. Друкарню я размясціў паблізу галоўнай рынкавай плошчы ў доме **Якуба Бабіча**, бурмістра Вільні. Бурмістрам даўней звалі галаву горада. Дзякуй яму за падтрымку!

Тут я найперш надрукаваў зборнік малітваў, песняспеваў і каляндарных святаў. Назваў яго **«Малая падарожная кніжка»**. Чаму малая і чаму падарожная? Вельмі проста! Малая – бо яна невялікага фармату, каб ёю было зручна карыстацца ў штодзённым жыцці. Падарожная – каб купцы ды іншыя людзі, хто часта бываў у дарозе, маглі браць кнігу з сабой.





# Крыжаванка



**Кім быў Францішак Скарына?**

1 Скарына па-філасофску разважаў пра Бога і месца чалавека ў свеце. Як называюць таго, хто арыгінальна мысліць, выказвае свой светапогляд?

2 З гонарам Скарына пісаў пра сябе: «У лекарскіх навуках доктар». Як называюць таго, хто лечыць людзей?

3 Францішак Скарына першы ў нашай краіне – Вялікім Княстве Літоўскім – надрукаваў кнігі. Значыць, ён – наш ...!

4 Скарына зрабіў пераклад Бібліі на беларускую мову. Як называюць таго, хто перакладае кнігі з адной мовы на іншую?

5 У кожнай сваёй кнізе Скарына з гонарам адзначаў: «Я, Францішак, Скарынін сын з Полацка». Як называюць чалавека, які любіць сваю радзіму?

6 Скарына шмат падарожнічаў па розных краінах Еўропы. Як называюць таго, хто любіць вандраваць?

7 На запрашэнне чэшскага караля Скарына працаваў у Каралеўскім садзе ў Празе. Як называюць чалавека, які даглядае сад і гадуе там расліны?

Вядома, я не толькі перакладаў і друкаваў кнігі. У мяне была сям'я. У Вільні я ажаніўся з Маргарытай, і ў нас нарадзіліся двое сыноў. Я шмат працаваў і клапаціўся пра сваю сям'ю. Не ўсё ў маім жыцці складвалася лёгка і проста. Аднаго разу мяне нават несправядліва зняволілі. Я сядзеў у турме за пазыкі брата, які заўчасна памёр. Але вялікі князь **Жыгімонт Стары** сваім загадам вызваліў мяне ад суда. Апошнім месцам маёй працы быў батанічны сад чэшскага караля Фердынанда ў Празе. Я працаваў там садоўнікам.



**22. Як звалі жонку Скарыны? Падкрэслі правільны адказ.**

Марыся   Маргарыта   Магдалена   Мілана






**Дзе можна сустрэць Скарыну сёння?**

**У музеях**

У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі можна ўбачыць кнігі Скарыны і ягоных паслядоўнікаў. У Музеі беларускага кнігадрукавання ў Полацку цікава раскажуць пра друкароў і працэс стварэння кнігі.

**На вуліцах**

Вуліцы імя Скарыны ёсць у Мінску, Віцебску, Нясвіжы, Оршы, Слуцку. У Полацку акрамя вуліцы ёсць яшчэ плошча і праспект.

**У мастацтве:** у літаратуры, кіно, жывапісе, скульптуры, графіцы, на манетах, марках і інш.
Сама болей помнікаў Скарыну ў беларускай сталіцы. Тут яны стаяць перад Нацыянальнай бібліятэкай, у двары Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, каля Нацыянальнай акадэміі навук, у парку імя Янкі Купалы. Помнікі і мемарыяльныя дошкі слаўтаму беларусу пастаўлены таксама ў Полацку, Вільні, Лідзе, Калінінградзе, Празе, Кішынёве.

**23. Расфарбуй Нацыянальную бібліятэку і намалюй помнік Скарыну перад ёю.**



**24. Знайдзі тры неадпаведныя словы і выкраслі іх.**

касманаўт
бакалаўр
студэнт
патрыёт
садоўнік
батанік
кнігавыдавец
лекар
паэт
доктар філасофіі



мастак
кнігазнавец
першадрукар
асветнік
фатограф
гуманіст
філосаф
бізнесовец
вандроўнік
лётчык
доктар медыцыны

ФРАНЦІШАК СКАРЫНА

**25. Уяві, што табе трэба зрабіць рэкламу скарынаўскім кнігам на вагоне цягніка метро. Як мог бы выглядаць такі вагон?**







## Асноўныя даты жыцця

**канец XV стагоддзя** – нарадзіўся ў Полацку

**да 1504 года** – вучыўся ў школах Полацка і Вільні

**1504 год** – паступіў у Кракаўскі ўніверсітэт на факультэт філасофіі

**1506 год** – здаў экзамен на ступень бакалаўра філасофіі ў Кракаўскім універсітэце

**1507–1512 гады** – прадоўжыў адукацыю ва ўніверсітэтах Еўропы

**1512 год** – здаў экзамен на ступень доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце

**1512–1517 гады** – перакладаў і рыхтаваў да друку Біблію

**1517–1519 гады** – выдаў 23 кнігі Старога Запавету ў Празе

**1522 год** – выдаў «Малую падарожную кніжку» ў Вільні

**1525 год** – выдаў кнігу «Апостал» у Вільні

**1530-я гады** – працаваў садоўнікам у батанічным садзе чэшскага караля Фердынанда ў пражскім раёне Градчаны

**1551 год** – прыблізная дата смерці ў Празе



аўтарка
ТАЦЯНА САПЕГА

мастачка
МАРЫЯ КАРАЛЁВА




*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Сапега** Тацяна, **Каралёва** Марыя

# СКАРЫНА ДЗЕТКАМ

*Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту*

Рэдактар *Зьміцер Санько*

Шыхтаванне *Уладзя Губіч*

Карэктарка *Паліна Грынчанка*

*У афармленні выкарыстана гарнітура Skaryna*
*(аўтар Аляксей Коваль)*

Падпісана да друку 12.05.23. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 1,95. Ул.-выд. арк. 2,0. Наклад 700 паас. Замова 295.

6+

Навукова-вытворчы кааператыў «Тэхналогія».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў
№ 1/379 ад 01.07.2014. Вул. Ляўкова, 19, оф. 2н, 220007, Мінск, Беларусь.
e-mail: technalohija@gmail.com. www.tn.by.

ЕАС

Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Джы энд Дзі». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/36 ад 13.01.2014.
Вул. Бурдзейнага, 37-191, 220136, Мінск, Беларусь.

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Бел)-44
С19

**ISBN 978-985-458-344-0**

ISBN 978-985-458-344-0
9 789854 583440



© Сапега Т., 2023
© Каралёва М., ілюстрацыі, 2023
© Афармленне. НВК «Тэхналогія», 2023